УДК 343.25

*А. В. Максімік,*
*курсант факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік: В. В. Валжанкоў,*
*старшы выкладчык кафедры*
*сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС*

# СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

У развітых краінах смяротнаму пакаранню заўсёды папярэднічае доўгі судовы разгляд на розных узроўнях, падсуднаму прадастаўляюцца магчымасці для падачы апеляцый. Часта гэта прыводзіць да таго, што паміж вынясеннем прысуду і яго выкананнем (альбо памілаваннем, а таксама смерцю асуджанага ад іншых прычын) праходзяць гады ці нават дзясяткі гадоў. Напрыклад, у ЗША (штат Джорджыя) Джэк Олдэрмэн (англ. Jack Alderman) быў асуджаны да смерці за забойства сваёй жонкі 14 чэрвеня 1975 года ва ўзросце 24 гадоў, а пакараны смерцю толькі 16 верасня 2008 года ва ўзросце 57 гадоў, больш чым праз 33 гады [1].

Пакаранне можа выконваць толькі ўпаўнаважаны прадстаўнік дзяржавы ў прызначаны час, інакш гэта дзеянне лічыцца забойствам і караецца законам.

У большасці сучасных дзяржаў смяротнае пакаранне прыводзіцца ў выкананне непублічна: на ім маюць права прысутнічаць толькі вызначаныя законам асобы.

У шэрагу выпадкаў смяротнае пакаранне можа быць заменена пажыццёвым зняволеннем або доўгім тэрмінам пазбаўлення волі па рашэнні суда. Прысуджаны судом да смяротнага пакарання таксама можа быць памілаваны вышэйшай службовай асобай дзяржавы або штата (прэзідэнтам, манархам, прэм’ер-міністрам, губернатарам і г. д.).

Пасля Другой сусветнай вайны ў свеце намецілася тэндэнцыя да скарачэння прымянення, а таксама поўнай адмены смяротнага пакарання. Адзначаецца, што не апошнюю ролю ў гэтым адыгралі нормы арт. 3 і 5 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН 10 снежня 1948 года, якія вызначаюць, што кожны чалавек мае права на жыццё і што ніхто не павінен падвяргацца катаванню або жорсткім, бесчалавечным і зневажаючым яго годнасць пакаранням [2]. Паводле меркавання калектыва кафедры крымінальнага права і крыміналогіі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, «у дадзеным кантэксце смяротнае пакаранне адназначна належыць да пакаранняў жорсткіх і бесчалавечных» [3]. Акрамя таго, адмена смяротнага пакарання

рэкамендавана Рэзалюцыямі Генеральнай Асамблеі ААН ад 8 снежня 1977 года і ад 15 снежня 1980 г, а таксама Другім факультатыўным пратаколам да Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, прынятым Генеральнай Асамблеяй ААН 15 снежня 1989 года [4].

У 1978 годзе смяротнае пакаранне было адменена ў Іспаніі, у 1981 годзе — у Францыі. З 1990 года смяротнае пакаранне адмянілі цалкам каля 40 краін і тэрыторый, у тым ліку Азербайджан, Арменія, Балгарыя, Вялікабрытанія, Венгрыя, Грэцыя, Грузія, Ірландыя, Італія, Канада, Кіргізія, Латвія, Літва, Малдова, Польшча, Румынія, Сербія, Славакія, Славенія, Туркменія, Украіна, Харватыя, Чарнагорыя, Чэхія, Швейцарыя, Эстонія.

Да сярэдзіны 2007 г. 89 краін адмянілі смяротнае пакаранне за ўсе злачынствы. Яшчэ 10 краін захавалі яго толькі для асобных асабліва цяжкіх злачынстваў, учыненых у ваенны час, выключыўшы магчымасць прызначэння смяротнага пакарання за агульнакрымінальныя злачынствы. 30 краін адмянілі смяротнае пакаранне на практыцы: не прыводзілі смяротныя прысуды ў выкананне апошнія 10 гадоў і ў далейшым збіраюцца прытрымлівацца мараторыя альбо афіцыйна абвясцілі аб увядзенні мараторыя на выкананне смяротных прысудаў [5, с. 138].

Такім чынам, да гэтага часу ў свеце налічваецца 130 краін, якія адмянілі смяротнае пакаранне ў законе або на практыцы, і 68 краін, якія захоўваюць і працягваюць ужываць гэтую меру.

З 1965 года больш за 50 краін пашырылі пералік злачынстваў, за якія можа быць прызначана пакаранне смерцю. Паводле звестак на 2010 год, у 21 краіне прадугледжана пакаранне смерцю за злачынствы, звязаныя з бяспекай краіны (шпіянаж, дзяржаўная здрада і г. д.). У 13 краінах увялі смяротнае пакаранне за тэрарызм, за паветранае пірацтва, калі гэта прывяло да гібелі людзей, за забойства заложнікаў. У некаторых краінах прадугледжана дадзенае пакаранне за выкраданне людзей, калі гэта прывяло да іх смерці. У 21 краіне ўстаноўлена смяротнае пакаранне за злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў. У 13 краінах смяротнае пакаранне прадугледжана за эканамічныя злачынствы (карупцыю, крадзеж дзяржаўных сродкаў, напад на супрацоўнікаў мытні, узброенае рабаванне). У шэрагу ісламскіх краін усталявана смяротнае пакаранне за распусту, згвалтаванне, гомасэксуалізм, палавую сувязь мусульманкі з прадстаўніком іншай веры [1].

Па дадзеных арганізацыі «Міжнародная амністыя», у 2006 годзе не менш як 1591 чалавек былі пакараныя ў 25 краінах і як мінімум 3861 чалавек былі прысуджаныя да смерці ў 55 краінах. У 2008 годзе найбольшая колькасць смяротных пакаранняў мела месца ў Кітаі (1718); у Іране лік пакараных быў як мінімум 346, у Саудаўскай Аравіі — 102, у ЗША — 37, у Пакістане — 36, у Іра-

ку — 34. Усяго ў 2008 годзе былі пакараны 2390 чалавек у 25 краінах [6]. Не зменшылася колькасць смяротных прысудаў у гэтых краінах і ў апошнія гады: некалькі тысяч чалавек прысуджваюцца штогод да смерці ў Кітаі, у 2016 г. у Іране пакарана смерцю 576 чалавек, у Саудаўскай Аравіі — 154, у Іраку — 88, у Пакістане — 87, у ЗША — 20. На гэтыя пяць краін прыпадае больш за 90 % усіх смяротных прысудаў у свеце [6].

Як бачым, нягледзячы на агульнасусветную накіраванасць да адмены альбо адмовы смяротнага прысуду ён яшчэ шырока выкарыстоўваецца ў шэрагу краін.

## Спіс асноўных крыніц

1. Колосов, В. Смертная казнь: «за» и «против» [Электронный ресурс] / В. Колосов // В. Колосов. Юридическая фирма. – Режим доступа: http://kolosov.info/yuridicheskie-stati/smertnaya-kazn. – Дата доступа: 04.02.2018. Вернуться к статье

2. Всеобщая декларация прав человека [Электронный ресурс]: [Принята и провозглашена резолюцией 217 А (III) Генеральной Ассамблеи от 10 декабря 1948 года] // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018. Вернуться к статье

3. Доклад Министра юстиции Республики Беларусь на «круглом столе» по проблематике смертной казни на тему «Перспективы отмены смертной казни в Республике Беларусь» [Электронный ресурс] / Белорусский республиканский союз юристов. – Режим доступа: http://www.union.by/info/other/e63e18a4a03e0235.html. – Дата доступа: 02.02.2017. Вернуться к статье

4. Германович, А. Расстрел за убийство. В Беларуси вынесен первый в этом году смертный приговор [Электронный ресурс] / А. Германович // Naviny.by. – Режим доступа: http://naviny.by/rubrics/disaster/2015/03/18/ic_articles_124_188476. – Дата доступа: 03.02.2018. Вернуться к статье

5. Лепешкина, О. И. Смертная казнь в России в контексте мировой тенденции к отмене / О. И. Лепешкина // Общество и право. – 2016. – № 2. – С. 138–145. Вернуться к статье

6. Число смертных казней в мире возросло на 56 % [Электронный ресурс] // AmnestyInternational. – Режим доступа: http://www.trust.ua/news/139925-cislo-smertnyh-kaznej-v-mire-vozroslo-na-56-amnesty-international.html. – Дата доступа: 03.02.2018. Вернуться к статье